Малыхіна, Л.Ю. Гістарыяграфія знешнепалітычнай дзейнасці БНР / Л. Ю. Малыхіна // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 55–61

***Л. Ю. МАЛЫХІНА***

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БНР

Сярод першых гісторыкаў знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) былі дзеячы гэтага ўтварэння і сучаснікі падзей. Першым грунтоўным даследаваннем рэвалюцыйнага і нацыянальнага руху беларусаў стала кніга гісторыка Ф. Ф. Турука «Белорусское движение», якая выйшла ў свет у Маскве ў 1921 г. Вядома, што Турук у 1918—1919 гг. працаваў у Беларускім нацыянальным камісарыяце, Наркамаце асветы РСФСР (старшынёй беларускага пададдзела). Таму аўтар меў доступ да матэрыялаў справаводства, заканадаўчых і актавых дакументаў. Нарыс быў падрыхтаваны на аснове асабістага архіва, а таксама дакладных запісак А. Л. Бурбіса, В. Л. Дылы, якія былі аддадзены ў маі 1920 г. у Наркамат замежных спраў РСФСР. Але да таго часу па пытанні знешнепалітычнай дзейнасці БНР былі выдадзены творы членаў урада БНР: Яз. Варонкі — старшыні Народнага Сакратарыята, К. Езавітава — міністра ваенных спраў, Я. Лёсіка — старшыні Рады БНР у чэрвені — кастрычніку 1918 г., А. Цвікевіча — міністра замежных спраў [1]. Пасля разгону Першага Усебеларускага з’езда, які, дарэчы, быў абмеркаваны на савецка-германскіх перамовах 4 студзеня 1918 г. у Брэст-Літоўску, работа «па рэалізацыі незалежніцкага ідэалу» бе-



ларусаў пераносіцца за мяжу (у Коўна, Берлін — «Беларуская місія», Парыж — «Вярхоўны трыбунал Міру») [2]. Публікацыя матэрыялаў па знешнепалітычнай дзейнасці ўрада БНР у кнізе стала адной з першых. Асаблівую цікавасць мелі тэлеграмы германскаму канцлеру Вільгельму II і Польскай «Радзе Рэгенцыйнай» у Варшаве.

Публікацыя Цвікевіча «Беларусь», выдадзеная Надзвычайнай дыпламатычнай місіяй Беларускай Народнай Рэспублікі ў Берліне ў 1919 г., была не першым яго асэнсаваннем утварэння БНР, а чарговай спробай прэзентаваць яе заходнееўрапейскім палітыкам, для якіх будучыня славянскіх нацый «облеклась в априорную формулу Федеративной России» [3]. Цвікевіч спасылаецца на выданне М. В. Доўнар-Запольскага, дзе знаходзілася карта дакладных меж БНР, прадстаўленая беларускай дэлегацыяй на Мірную канферэнцыю ў Парыжы. Гэтыя межы былі вызначаны згодна з *«Картой разселенія белорусскаго племени. Изд. Россійской Академии Наук. С. П. Б., 1917».* Ва ўмовах нямецкай акупацыі краю 1918 г. расійскую ці польскую ўладу на тэрыторыі Беларусі Цвікевіч лічыў малаверагоднай. У цэлым выданне «Беларусь», якое характарызавала дзейнасць урада БНР на бягучы момант, прадстаўляла спробу звярнуць увагу міжнародных арганізацый на праблему захавання суверэнітэту БНР.

Важнай крыніцай з’яўляецца і праца Язэпа Варонкі «Беларускі рух ад 1917 да 1920 году», у якой выкладзена гісторыя паступовага збліжэння Рады БНР і Літоўскай Тарыбы, ахарактарызавана дзейнасць беларускіх дыпламатычна-консульскіх прадстаўніцтваў у Кіеве, Адэсе, Стаўрапалі, Вільні, Маскве, а таксама сказана аб рабоце надзвычайных місій у Кіеве, Варшаве, Берліне, Капенгагене і Берне [4].

Працы Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага ў шэрагу твораў па гісторыі БНР адрозніваюцца прафесійна глыбокім падыходам даследчыка да праблем беларускай дзяржаўнасці. У маі — кастрычніку 1918 г. у складзе дыпламатычнай місіі БНР у Кіеве ён вёў перагаворы з прадстаўнікамі РСФСР, Украіны, Дона, Германіі, Аўстра-Венгрыі аб прызнанні Беларусі суб’ектам міжнароднага права. Па даручэнні ўрада БНР гісторык стварыў «Мемуар» («Асновы дзяржаўнасці Беларусі»), у якім абгрунтаваў неабходнасць існавання самастойнай беларускай дзяржавы [5]. У абагульняючай працы вучонага — «Гісторыя Беларусі» — падрабязна апісана дыпламатычная дзейнасць урада БНР у Кіеве і Адэсе: перамовы аб мяжы і дзейнасць гандлёвай палаты [6].

Важнай для даследавання з’яўляецца і публікацыя А. Чарвякова «За Савецкую Беларусь». У ёй аўтар адзначыў, што ў 1918 г. урад БНР імкнуўся знайсці апору ў Германіі, а ў сувязі са змяненнем палітычнай абстаноўкі БНР змяніла сваю арыентацыю на Літву, а ў 1919 г. — на Польшчу [7].



Пытанні, якія тычацца знешняй палітыкі БНР, знайшлі адлюстраванне ў артыкуле Г. Парэчына. Аўтар паказаў, як ад ідэі аўтаноміі ў складзе Расіі ў 1917 г. беларускі рух эвалюцыяніраваў да ідэі поўнай

нацыянальнай незалежнасці [8]. А. Станкевіч у рабоце «Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення» пісаў, што ў часы першай сусветнай вайны не было і размовы аб магчымасці палітычнай незалежнасці Беларусі. Выказваліся думкі аб федэрацыі ці канфедэрацыі літоўска-беларускай або расійска-беларускай федэрацыі [9]. Калі ў канцы 1917 г. ствäралася дзяржаўнасць Літвы, нямецкія ўлады заявілі, што ў Тарыбу побач з літоўцамі павінны ўвайсці і беларусы [10]. Права самавызначэння Літвы і Беларусі, пажаданне іх федэрацыі з Польшчай, што павінны былі вырашыць іх сеймы, падкрэслілі 25 снежня 1917 г. ППС, Польская сялянская партыя, Група нацыянальнай незалежнасці і Аб'яднанне дэмакратычных партый. У той жа час гаворка ішла пра землі, акупіраваныя нямецкай арміяй, што, паводле А. Станкевіча, не давала фактычнай магчымасці невялікай групе свядомых беларусаў думаць асобна аб сваёй краіне. У тэлеграме нямецкаму парламенту ад 1 верасня 1917 г. ад імя беларускіх грамадзян, выказвалася ідэя, што немцы дапамогуць рэалізаваць палітычныя ідэалы беларусаў «на падставе лучнасці з этнаграфічнай Літвой і Курляндыяй». Але пытанне аб утварэнні суверэннай Беларусі на Першым Усебеларускім з'ездзе, пісаў Станкевіч, не было даведзена да канца: ён затрымаўся на федэрацыі з Расіяй — на беларускай зямлі яшчэ стаяла расійская армія, з якой змагацца беларусам было не пад сілу.

Асэнсаванне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі зрабіў старшыня ўрада і міністар замежных спраў БНР Антон Луцкевіч [11]. Яго выданне «За 25 гадоў (1903—1928)» носіць мемуарны характар, паколькі напісана ў астрозе, дзе немагчыма было карыстацца архівамі і іншымі крыніцамі.

У 30-я гг. гісторыя Беларускай Народнай Рэспублікі савецкімі даследчыкамі асвятлялася з паслядоўных класавых пазіцый. БНР разглядалася толькі як марыянетачнае ўтварэнне нямецкай акупацыйнай улады [12]. Пасля палітычных рэпрэсій супраць удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху пытанне аб дзейнасці БНР на доўгі час было закрыта, а матэрыялы па ім знаходзіліся ў спецыяльных сховішчах архіваў.

У даследаваннях беларускіх вучоных 70—80-х гг. знешнепалітычная дзейнасць БНР асвятлялася фрагментарна і аднабакова. У першых работах В. А. Круталевіча кіруючыя органы БНР былі прадстаўлены як контррэвалюцыйная сіла, якая імкнулася атрымаць уладу з рук акупантаў. Тым не менш вучоны зрабіў заключэнне, што нямецкая ўлада не прызнала БНР, таму Рада была вымушана шукаць падтрымку ў іншых краін [13]. Значным укладам у



распрацоўку дыпламатычнай справы ў 1918—1920 гг. з'явілася грунтоўная манаграфія вучонага «История Беларуси: Становление национальной державности» (Мн., 1999). У ёй В. А. Круталевіч прааналізаваў працэс утварэння БНР з улікам знешнепалітычных абставін і ваеннага фактару. У выданні асвятляецца работа беларускай дэлегацыі на Парыжскай канферэнцыі, распавядаецца аб спробе ўрада знайсці апору ў Польшчы.

І. І. Коўкель і М. С. Сташкевіч, аддаючы значную ўвагу дзейнасці палітычных арганізацый, якія ўваходзілі ў Раду БНР, сабралі багаты фактычны матэрыял па перыяду 1917—1922 гг. [14] Вядомы беларускі гісторык І. М. Ігнаценка адзначыў, што першым крокам у дзейнасці кіраўніцтва БНР стала менавіта імкненне да прызнання іншымі дзяржавамі. У сувязі з гэтым БНР спрабавала наладзіць адносіны з Украінай і Германіяй, Літвою і РСФСР. Вучоны зрабіў аналіз складу Першага Усебеларускага з'езда, яго рашэнняў, што стала пачаткам новага падыходу да праблемы БНР [15]. У апошніх публікацыях І. М. Ігнаценка даў больш поўную характарыстыку палітыцы БНР за 1918—1920 гг. На думку гісторыка, адсутнасць адзінства ў кіраўніцтве БНР таксама была адной з прычын, якія не дазволілі рэалізаваць ідэю буржуазна-дэмакратычнай рэспублікі [16].

У сувязі са змяненнямі ў сацыяльна-палітычным жыцці ў 90-я гг., набыццём беларускай рэспублікай суверэнітэту, рэзка ўзрасла колькасць публікацый па актуальных пытаннях БНР. Для вывучэння замежнай дзейнасці БНР несумненную каштоўнасць маюць публікацыі А. М. Сідарэвіча [17]. Нарыс аўтара ў гістарычнай энцыклапедыі, прысвечаны БНР, быў адной з першых спроб у сучаснай гістарыяграфіі даць аб'ектыўнае асвятленне існавання БНР. А асэнсаванне ім дзейнасці А. І. Луцкевіча на пасадзе старшыні ўрада БНР дапамагае больш поўна зразумець працэс фарміравання палітычных ідэалаў беларускага нацыянальнага руху.

У пачатку 90-х гг. А. Міхальчанка, намеснік начальніка Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР, на адной з сустрэч з гісторыкамі паведаміў: «Мы атрымалі 21 справу па БНР, якіх пакуль не бачылі нашы даследчыкі. Зняты абмежаванні на допуск з 72 % спраў... Сярод нявывучаных дакументаў — справа аб дзейнасці консульства БНР у Канстанцінопалі. У мемарандуме ад 14 лютага 1921 г. сказана: БНР прызнавалі Эстонія, Латвія, Грузія, Фінляндыя, Літва, Украінская Цэнтральная рада, Польшча». Знойдзеныя матэрыялы сведчылі пра сувязь БНР з Дзянікіным, Махно; у навуковы ўжытак уводзіліся новыя дакументы і матэрыялы. Гэта сведчыла аб пачатку новага асэнсавання праблемы БНР, узбагачэння яе навуковай базы [18].

У 1997 г. быў апублікаваны першы том дакументаў і матэрыялаў «Знешняя палітыка Беларусі», змест якога сведчыць аб імкненні лідэраў беларус-

кага нацыянальнага руху ўтварыць незалежную дзяржаву [19]. Адна з апошніх апублікаваных крыніц па вывучэнні знешняй палітыкі БНР — двухтомнае выданне С. Шупы «Архивы Белорусской Народной Республики» (1998).

У апошні час у навуковых выданнях апублікаваны шэраг артыкулаў аб заключэнні Брэсцкага і Рыжскага мірных дагавораў, аб межах БНР і рабоце дыпламатычных місій у Германіі і ва Украіне. У іх паказана імкненне радаўцаў адстаяць нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы сваёй радзімы [20]. З улікам новых крыніц былі падрыхтаваны і абаронены кандыдацкія дысертацыі Л. А. Кавалёвай, В. Г. Мазца. Д. А. Мігуна, Т. Я. Паўлавай і А. В. Ціхамірава [21].

Такім чынам, сучасныя даследчыкі ўвялі ў навуковы ўжытак новыя дакументы і матэрыялы. Аднак сістэматызаваная работа па знешнепалітычнай дзейнасці БНР яшчэ не выдадзена. Практычна ўся літаратура, прысвечаная БНР, — гэта даследаванні знешнепалітычнай пазіцыі першага беларускага ўрада. У гэтым спецыфіка кожнай маладой дзяржавы, якая стаіць перад неабходнасцю вызначэння свайго сацыяльна-палітычнага статуса перад сусветнай супольнасцю. Гісторыя дыпламатыі БНР — гэта гісторыя поспехаў і пралікаў на цяжкім шляху ўстанаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

---

[1] *Доўнар-Запольскі М.* Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Городно, 1919; *Воронко Яз.* Белорусский вопрос к моменту версальской мирной конференции. Ковна, 1919; *Воронка Яз.* Беларускі рух ад 1917 до 1920 году. Коўна, 1920; *Езовитов К.* Белорусы и поляки. Ковна, 1919; *Канчер Е. С.* Белорусский вопрос. Петроград, 1918; *Лёсік Я.* Аўтаномія Беларусі. Менск, 1917; *Цвикевич А.* Краткий очерк возникновения БНР. Киев, 1918; *Ён жа.* Беларусь: Политический очерк. Берлин, 1919.

[2] *Турук Ф. Ф.* Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов. [Воспр. изд. 1921]. Мн., 1994. С. 32.

[3] *Цвикевич А.* Беларусь: Политический очерк. С. 3.

[4] *Варонка Я.* Беларуская справа міравой нарады ў Версалі: Гіст.-паліт. нарыс. Коўна, 1919; *Ён жа.* Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: Кароткі агляд. Коўна, 1920. С. 8.

[5] *Доўнар-Запольскі.* Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Городно, 1919.

[6] *Доўнар-Запольскі М. В.* Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 496.

[7] *Чарвякоў А.* За Савецкую Беларусь. Мн., 1927. С. 128—130.

[8] *Парэчын Г.* Ідэя беларускай дзяржаўнасці перад утварэннем Савецкай Беларусі // Зах. аддзел гуманіт. навук БАН. Працы кафедры сучаснага права. Т. 1. Мн., 1929.

[9] *Станкевіч А.* Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. Вільня, 1935. С. 74—80.

[10] *Abramowicz L.* Problemy Litwy podczas wojny // Zbiór dokumentów, odezw i t. p. Warszawa, 1918. S. 16.



[11] *Луцкевіч А. І.* Польская акупацыя ў Беларусі. Вільня, 1920; Рэпрынт. выд. Мн., 1992; *Ён жа.* За дваццать пяць гадоў (1903—1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларус. Сац. Грамада. Вільня, 1928.

[12] *Сенкевич А.* За ленинскую линию в национальной политике. Мн., 1931; *Щербаков В.* Классовая борьба и историческая наука в Белоруссии. Мн., 1934; *Лочмель И. Ф.* Освобождение Белоруссии от белопольских оккупантов 11 июля 1920 г. Мн., 1939.

[13] *Круталевич В. А.* Рождение Белорусской Советской Республики. На пути к провозглашению республики. Октябрь 1917 — декабрь 1918. Мн., 1975; *Ён жа.* Рождение Белорусской Советской Республики. Провозглашение республики. Развертывание национального государственного строительства. Ноябрь 1918 — февраль 1919. Мн., 1979.

[14] *Ковкель И., Сташкевич Н.* Почему не состоялась БНР? Из истории политического банкротства националистической контрреволюции в Белоруссии (1917—1918). Мн., 1984; *Сташкевіч М. С.* Вялікі Кастрычнік на Беларусі. Мн., 1985; *Ён жа.* На зломе часу: Да пытання беларускай дзяржаўнасці // Маладосць. 1989. № 8.

[15] *Игнатенко И. М.* Беднейшее крестьянство — союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917—1919). Мн., 1962; Иностранная военная интервенция в Белоруссии 1917—1920 / И. М. Игнатенко, И. П. Ломако, Е. К. Прыгунова и др.; Под ред. И. М. Минц. Мн., 1990; *Ігнаценка І.* Ці была БНР? // Звязда. 1990. 24 сак. С. 3; *Ён жа.* Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. Мн., 1992.

[16] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / Рэдкал.: М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. Мн., 1995. Ч. 2. С. 59.

[17] *Сидоревич А.* Антон Луцкевич // Неман. 1990. № 7. С. 91—171; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1993. Т. 1. С. 384—390.

[18] На скрыжаванні думак: Вучоныя аб «белых плямах» гісторыі Беларусі / Склад. Я. І. Бараноўскі. Мн., 1990.

[19] Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў. Т. 1 (1917—1922). Мн., 1997.

[20] *Волаціч М.* Лінія Керзана на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зменаў ва Усходняй Еўропе // Спадчына. 1993. № 6. С. 16; *Мазец В.* Межы БНР // Спадчына. 1993. № 2. С. 78—83; *Ціхаміраў А.* Беларуская праблематыка на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919—1920 гг. // Весці АН Беларусі. Сер. грамад. навук. 1996. № 6. С. 31; Дакументы дыпламатычнай чыннасці БНР у Нямеччыне // Спадчына. 1998. № 4. С. 89—99; *Тихомиров А. В.* Брестский мир и Беларусь // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 1999. № 2. С. 44—57; *Павлова Т.* К вопросу о границах БНР // Там жа. 1999. № 1. С. 77—83; *Яна ж.* Вытокі дыпламатыі БНР // Там жа. 1999. № 3. С. 51—54; *Яна ж.* Брестский мирный договор // Дипломатический словарь-справочник: В 2 т. Мн., 1999. Т. 1; *Яна ж.* Беларусь и Брестский мир // Беларусь і свет. Мн., 2000. Т. 2. С. 77—86; *Яна ж.*

Знешнепалітычная дзейнасць і дыпламатыя БНР у 1918 // Беларус. гіст. часоп. 2000. № 1. С. 24—28; *Лебедзева В*. Пратаколы беларуска-ўкраінскіх перамоў аб мяжы. Кіеў, красавік 1918 // Архівы і справаводства. 2000. № 5. С. 93—103.



21 *Ковалёва Л. А*. Внешнеполитическая деятельность Советской Белоруссии в 1919—1929 гг. Мн., 1993; *Ціхаміраў А*. Беларуская эміграцыя. 90-я гг. XIX ст. —1917 г. Мн., 1993; *Мазец В. Г.* Беларуская Народная Рэспубліка: абвяшчэнне і дзейнасць (1918). Мн., 1995; *Мигун Д. А*. Политика Германии в отношении Беларуси 1914—1922 гг. Мн., 2001.

У час падрыхтоўкі навуковай канферэнцыі, матэрыялы якой друкуюцца, была абаронена кандыдацкая дысертацыя Т. Я. Паўлавай «Внешнеполитическая деятельность Белорусской Народной Республики в 1918—1920 гг.». (Мн., 2001).